# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА

Праграма для студэнтаў I курса
філалагічнага факультэта спецыяльнасцей
1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках),
1-21 05 02 «Руская філалогія» (па напрамках)

Мінск
РІВШ
2018

УДК 398:378.141(073.8)
ББК 82.3:74.58
Ф19

Р э к а м е н д а в а н а
саветам філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 6 ад 5 красавіка 2018 г.)

С к л а д а л ь н і к і :
*В. В. Прыемка, Т. А. Марозава, Л. В. Камлюк-Ярашэнка*

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філалагічных навук прафесар *В. С. Новак;*
кандыдат культуралогіі дацэнт *В. В. Калацэй*

Ф19 **Фальклорная** практыка : праграма для студэнтаў I курса філалагічнага факультэта спецыяльнасцей 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках), 1-21 05 02 «Руская філалогія» (па напрамках) / склад. : В. В. Прыемка, Т. А. Марозава, Л. В. Камлюк-Ярашэнка; пад рэд. В. В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2018. – 40 с.

У адпаведнасці з агульнаадукацыйным стандартам па фальклорнай практыцы ў праграме прадстаўлена характарыстыка відаў практыкі па фальклору, метады збірання фальклорных матэрыялаў, патрабаванні да іх запісу і правілы афармлення твораў для захавання ў архівах.

Адрасавана студэнтам-філолагам I курса дзённай і завочнай формаў навучання, кіраўнікам груп па правядзенні фальклорнай практыкі.

**УДК 398:378.141(073.8)**
**ББК 82.3:74.58**

© Прыемка В. В., Марозава Т. А., Камлюк-Ярашэнка Л. В., складанне, 2018
© Афармленне. ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», 2018

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Фальклорная практыка студэнтаў філалагічнага факультэта з'яўляецца неад'емнай часткай вучэбнага працэсу пры падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» і 1-21 05 02 «Руская філалогія» ў адпаведнасці з агульнаадукацыйным стандартам і тыпавым вучэбным планам. Формы праходжання фальклорнай практыкі:

1) палявая практыка: выезд груп з навуковым кіраўніком у запланаванае месца экспедыцыі (на фінансавых умовах аплаты ўсіх выдаткаў вну);

2) пры адсутнасці фінансавання:

а) самастойнае праходжанне практыкі студэнтамі па месцы жыхарства з прадстаўленнем справаздачы аб выніках збіральніцкай дзейнасці;

б) праца ў архіўных фальклорных фондах пры кафедры, якая ажыццяўляе практыку ў вну;

в) праца па індывідуальных праграмах (замежныя студэнты).

Праграма зарыентавана на сучасную канцэпцыю агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы. Фальклор падаецца як багацейшы культурны скарб кожнага народа, сродак выяўлення яго нацыянальнай свядомасці, умова выхавання патрыёта сваёй краіны, грамадзяніна з высокім узроўнем нацыянальнай годнасці.

Дадзеная праграма абапіраецца на вучэбна-метадычны дапаможнік «Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік» (аўтары-складальнікі: Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава; БДУ, 2009), на тыпавыя вучэбныя праграмы па курсах «Фалькларыстыка» (аўтары-складальнікі: І. В. Казакова, І. А. Швед; РІВШ, 2009) і «Беларускі фальклор» (аўтар-складальнік Р. М. Кавалёва; БДУ, 2008), вучэбныя праграмы «Фольклор славянских народов» (аўтар-складальнік В. В. Прыемка; БДУ, 2008) і «Фальклорная практыка» (аўтары-складальнікі: Р. М. Кавалёва, С. І. Крылова, Т. А. Марозава, В. В. Прыемка; БДУ, 2009) і вучэбна-метадычны дапаможнік для выкладчыкаў вну па курсе «Фалькларыстыка» (аўтары-складальнікі: Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка; РІВШ, 2009).

Праграма каардынуецца з праграмамі іншых дысцыплін вучэбнага плана – усходнеславянскай міфалогіяй, уводзінамі ў літаратуразнаўства, тэорыяй літаратуры. Адсюль увядзенне ў праграму невялікай колькасці тэрмінаў і паняццяў, якія ў цяперашні час шырока выкарыстоўваюцца ў міждысцыплінарных даследаваннях і даказалі сваю эфектыўнасць пры аналізе фальклорных з'яў.

**Мэта фальклорнай практыкі** – авалоданне першаснымі практычнымі навыкамі прафесійнай дзейнасці, якая звязана са збіраннем фальклору. Гэта асабліва актуальна сёння, калі першакурснікі ўсе больш арыентуюцца на самастойнае праходжанне фальклорнай практыкі.

**Задачы практыкі:**

1) паглыбіць і пашырыць веды студэнтаў па фальклору, атрыманыя на лекцыях і практычных занятках;

2) пазнаёміць студэнтаў з жывым бытаваннем твораў вуснай народнай творчасці;

3) набыць навыкі збіральніцкай дзейнасці ў практычным ключы – праз непасрэдныя сустрэчы з выканаўцамі фальклорных твораў, усталяванні кантактаў з імі, выкліканні зацікаўленасці і разумення мэтазгоднасці перадачы фальклорных твораў маладому пакаленню.

У адпаведнасці з агульнаадукацыйным стандартам па фальклорнай практыкі студэнт-філолаг павінны:

**ведаць**: тэорыю фальклору, падзел фальклорнай спадчыны на роды, віды, жанры і ўнутрыжанравыя разнавіднасці; асаблівасці асобных фальклорна-этнаграфічных комплексаў, іх адміністрацыйна-тэрытарыяльную лакалізацыю;

**умець**: самастойна адрозніваць жанры і жанравыя разнавіднасці фальклорных адзінак; суадносіць сведчанні інфарманта з уласнымі ведамі па тэорыі фальклору пры вызначэнні віду і жанру; карыстацца сучаснымі тэхнічнымі сродкамі фіксацыі фальклорных твораў; адрозніваць фальклорныя творы ад псеўдафальклорных (індывідуальна-аўтарскіх песень, вершаў, папулярных раней і цяпер, і г. д.);

**валодаць**: навыкамі вядзення гутаркі з людзьмі рознага ўзросту, прафесіі, статусу; сістэматызацыі і класіфікацыі вусна-паэтычных твораў розных відаў і жанраў; выяўлення лакальна-адметных твораў фальклору па дыялектных асаблівасцях, жанравых прыкметах, дакладнай пашпартызацыі твора.

Тэрмін праходжання практыкі – 14 дзён. Пры падрыхтоўцы да праходжання практыкі студэнты на працягу семестра прыходзяць на кансультацыі да супрацоўнікаў архіваў пры кафедры, якая забяспечвае выкладанне фальклярыстыкі на факультэце (гэта можа быць лабараторыя або кабінет, пры якім замацаваны архіў. Калі такія структурныя адзінкі не прадугледжаны ў навучальнай установе, гэту працу ажыццяўляе кафедра[1]). Мэта правядзення кансультацый – пазнаёміць студэнтаў з афармленнем выніковых справаздач па фальклорнай практыцы, з запісанымі фальклорнымі творамі, з сістэмай захоўвання фальклорных адзінак у архіўных фондах, складаннем рэестравых ведамасцей уліку матэрыялаў, з працай у архівеўвогуле. Колькасць кансультацый не рэгламентуецца.

[1]На філалагічным факультэце БДУ ў якасці такой адзінкі функцыянуе Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору кафедры тэорыі літаратуры. Лабараторыя ажыццяўляе ўсе віды працы па камплектацыі 5 фальклорных архіваў філалагічнага факультэта БДУ. Тут і далей будуць прыведзены прыклады з вопыту дзейнасці дадзенай структурнай адзінкі.

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

## АРГАНІЗАЦЫЯ І КІРАЎНІЦТВА ПРАКТЫКАЙ

1. Фальклорную практыку праходзяць усе студэнты І курса філалагічнага факультэта спецыяльнасцей «Беларуская філалогія» і «Руская філалогія».

2. Да палявой экспедыцыйнай работы і самастойнай практыкі па месцы жыхарства дапускаюцца студэнты, якія прайшлі медкамісію і інструктаж па ахове працы. У лабараторыю накіроўваюцца студэнты, стан здароўя якіх не дазваляе ажыццяўляць збіральніцкую працу або якія маюць іншыя ўважлівыя прычыны (сямейныя абставіны і інш.).

3. Тэрміны правядзення практыкі прадугледжаны вучэбным планам філалагічнага факультэта.

4. Для праходжання практыкі студэнты-практыканты падзяляюцца на групы.

5. Кіраўніцтва практыкай студэнтаў І курса ажыццяўляе кафедра, якая забяспечвае выкладанне дысцыпліны «фальклпарыстыка» на філалагічным факультэце.

6. Для правядзення практыкі кафедра прызначае кіраўніка практыкі і кіраўнікоў студэнцкіх груп.

У абавязкі кіраўніка фальклорнай практыкі ўваходзіць:

1. Распрацоўка праграмы практыкі.

2. Вызначэнне базы практыкі, правядзенне працы з установамі па прадстаўленні жылых памяшканняў для студэнтаў на час практыкі і заключэнні дамовы паміж універсітэтам і ўстановамі, якія прадстаўляюць жыллё.

3. Размеркаванне студэнтаў па групах.

4. Правядзенне інструктажа для кіраўнікоў груп студэнтаў.

5. Арганізацыя і правядзенне ўстановачнай кансультацыі з кіраўнікамі груп.

6. Азнаямленне студэнтаў-практыкантаў са спецыфікай экспедыцыйнай збіральніцкай работы, з працай у лабараторыі і па індывідуальных праграмах, а таксама з вучэбна-метадычнай літаратурай па практыцы.

7. Наведванне і аналіз практыкантамі асобных мерапрыемстваў, якія праводзяцца для збору інфармацыі.

8. Вызначэнне тэматыкі, метадалогіі і методыкі індывідуальнай збіральніцкай і камеральнай працы.

9. Кантроль за ходам практыкі.

10. Падвядзенне вынікаў фальклорнай практыкі, складанне справаздачы.

У абавязкі кіраўніка групы ўваходзіць:

1. Арганізацыя выезду і пасялення студэнтаў на базе практыкі; падрыхтоўка памяшканняў архіваў лабараторыі для прыёму студэнтаў на практыку.

2. Складанне графіку і маршруту экспедыцыйнай працы студэнтаў і кантроль за іх выкананнем; складанне графіку наведвання і кантролю аб'ёму выкананых у лабараторыі відаў работ.

3. Дапамога практыкантам у правядзенні збіральніцкай і камеральнай працы.

4. Наведванне і абмеркаванне практыкантамі асобных мерапрыемстваў, якія праводзяцца для збору інфармацыі.

5. Кантроль за вядзеннем дзённікаў.

6. Праверка выніковай дакументацыі студэнтаў і ацэнка работ.

7. Складанне справаздачы аб працы студэнцкай групы.

## ТЭХНІКА БЯСПЕКІ ПАДЧАС ПРАХОДЖАННЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫКІ

### 1. АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ БЯСПЕКІ

1.1. Да праходжання практыкі дапускаюцца студэнты, якія прайшлі інструктаж па ахове працы і вывучылі інструкцыю па ахове працы.

1.2. Студэнты абавязаны ведаць і выконваць асноўныя патрабаванні па забеспячэнні ўмоў побыту, правілы і нормы тэхнікі бяспекі, пажарнай і электрабяспекі, умець аказваць першую даўрачэбную дапамогу.

1.3. Умовы бяспекі пераезду студэнтаў на аўтатранспарце забяспечваюцца гаспадарчымі арганізацыямі, якія нясуць поўную адказнасць за тэхнічны стан транспарту, яго эксплуатацыю і замацаванне высокакваліфікаваных вадзіцеляў.

1.4. Пражыванне і праца студэнтаў у памяшканнях у адпаведнасці з санітарнымі і супрацьпажарнымі правіламі бяспекі забяспечваюцца прымаючым бокам.

1.5. Студэнты-практыканты абавязаны выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку.

### 2. ПАТРАБАВАННІ БЯСПЕКІ ПАДЧАС ПРАЦЫ

2.1. Пры выкарыстанні тэхнічных сродкаў (дыктафон, тэлефон, смартфон) выконваць правілы эксплуатацыі, якія ўказаны ў пашпарце выкарыстоўваемага сродку.

2.2. Для бяспечнага руху неабходна выконваць правілы пераходу чыгункі і шасэйных дарог, вуліц, перамяшчэння па дарозе без тратуара і да т. п.

2.3. Выконваць правілы паводзінаў каля вадаёмаў (*купанне забараняецца* ў вадаёмах, не рэкамендаваных СЭС для купання ў сувязі з небяспекай узнікнення інфекцыйных захворванняў, у неабсталяваных месцах, без адпаведнага дазволу кіраўніка групы; *забараняецца* заплываць за абмежавальныя знакі месцаў, прызначаных для купання, падплываць да чоўнаў, баржаў і г. д., залазіць на тэхнічныя і папярэджваючыя знакі, буйкі і іншыя прадметы, забруджваць ваду і бераг, кідаць бутэлькі, банкі і іншыя прадметы, скакаць у ваду з пабудоваў, не прызначаных для гэтых мэтаў).

2.4. Выконваць пажарную бяспеку.

## 3. ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА ПРАЦОЎНАГА РАСПАРАДКУ

Студэнт абавязаны:

3.1. Выконваць устаноўленую працягласць працоўнага часу: займацца зборам (або апрацоўкай) фальклорных матэрыялаў 6 гадзін штодзённа.

3.2. Штодзённа паведамляць кіраўніку групы аб маршруце, месцы і часе выканання збіральніцкай дзейнасці.

3.3. Прысутнічаць на базе практыкі ў вольны ад працы час (адыходзіць толькі па дамоўленасці з кіраўніком групы).

3.4. Прысутнічаць на базе практыкі: з 22.00 да 8.00 г. – на палявой практыцы, з 10.00 да 16.00 – у лабараторыі фальклору.

Забараняецца:

3.5. Распіваць спіртныя напоі.

3.6. Прыводзіць на базу (у лабараторыю) асобаў, якія не маюць дачынення да практыкі.

У выніку парушэння працоўнай дасцыпліны студэнт будзе адасланы з месца праходжання практыкі з акадэмічнай запазычанасцю; атрымае вымову; будзе пазбаўлены стыпендыі на тэрмін, вызначаны дэканатам.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ

## І. ПАЛЯВАЯ ПРАКТЫКА

Палявая (збіральніцкая) практыка ажыццяўляецца ў дзвюх формах:

1) экспедыцыйная (групавая) – праводзіцца падчас кароткачасовых (двухтыднёвых) выездаў у вобласці ці асобныя раёны з мэтай іх абследавання і збірання фальклорных матэрыялаў;

2) самастойная (індывідуальная) – праводзіцца збіральнікам па месцы жыхарства, мае лакальны характар, не абмежавана па часе збірання фальклорных матэрыялаў, таму што студэнт самастойна вызначае працягласць збіральніцкай дзейнасці ў залежнасці ад пастаўленай задачы.

## Этапы правядзення палявой практыкі

*Падрыхтоўка да збіральніцкай работы*

Заданні:

- вывучыць метадычную літаратуру і законспектавацьяе;
- вывучыць праграмы-апытальнікі.

Праграмы-апытальнікі павінны падрыхтаваць студэнтаў да трох асноўных камунікатыўных сітуацый:

1) разведачнай (мэта якой – пошук выканаўцаў, высвятленне іх інтарэсаў, магчымасцей выканання пэўных фальклорных твораў);

2) апытальніцкай (размова з выканаўцам, пытанні, якія падштурхнуць да выканання фальклорных твораў);

3) тлумачальнай (для атрымання інфармацыі для пашпарту, каментарыяў да тэкстаў);

- кансультацыі ў архіве пры кафедры, якая забяспечвае выкладанне дысцыпліны «фалькларыстыка» на філалагічным факультэце.

Задачы:

1) пазнаёміцца з сістэмай працы і архіўнымі фондамі;

2) асабіста пазнаёміцца са справаздачамі студэнтаў, якія захоўваюцца ў архівах;

3) набыць навыкі афармлення выніковай справаздачы ў электронным і рукапісным варыянтах;

4) усвядоміць каштоўнасць і карыснасць збіральніцкай дзейнасці і наступнай працы па афармленні справаздачы.

*Этап непасрэднай збіральніцкай работы*

Віды работы:

- складанне карты мясцовасці, якая будзе абследавана;
- арганізацыя збіральніцкіх груп (для групавых практык);
- складанне маршрута кожнай групы (ці асабістага маршрута);
- складанне графіка кантрольных наведванняў (для ацэнкі збіральніцкай дзейнасці кіраўніком), падчас якіх ацэньваюцца камунікатыўныя здольнасці (валоданне сітуацыяй, уменне весці размову), методыка збіральніцкай работы, тэхніка запісу.

Палявая праца мае разведачны характар: студэнты павінны выяўляць складнікі мясцовай фальклорнай традыцыі, жанравы склад і характар бытавання фальклору. Таму студэнты запісваюць тэксты розных жанраў (найперш прозу, а таксама песні, балады, гульні і інш.). Абавязкова фіксуюцца каментарыі выканаўцаў да тэкстаў – тое, што можна назваць «народнай герменеўтыкай».

Разам са збіраннем фальклору студэнты займаюцца і этнаграфічнай працай: фатаграфуюць ці замалёўваюць выгляд ручнікоў, кужалёў, абрусаў, фрагменты вышыўкі і арнаменту, прадметы побыту і прылады працы перыяду традыцыйнага фальклору і сучаснасці. Гэтыя матэрыялы актыўна

выкарыстоўваюцца ў рамках курса «Фалькларыстыка», на практычных занятках і ў самастойнай рабоце па тэмах «Семіётыка фальклору», «Фальклорна-этнаграфічныя комплексы».

Дадаткова студэнты працуюць над даследчыцкімі тэмамі, шукаючы матэрыялы для курсавога праектавання.

Пры праектаванні праграмы разведачнай практыкі магчыма правядзенне экскурсіі па цікавых месцах на тэрыторыі правядзення практыкі, якія пакінуць станоўчыя ўражанні ў студэнтаў, што будзе спрыяць цэласнасці экспедыцыйнай працы.

Разам з экспедыцыйнай і экскурсійнай працай праграма выязной практыкі можа ўключаць такія віды актуалізацыі інтарэсу і зацікаўленасці студэнтаў, як:

- справаздачы збіральніцкіх груп, якія можна ладзіць у выглядзе ролевых гульняў (напрыклад, «Прэзентацыя працы групы з пункту погляду…», «Рэклама жанру»);
- псіхалагічныя трэнінгі па кантакталогіі і міжасабовых і міжнацыянальных стасунках (прыблізная тэматыка: «Прэзентацыя ролі ўдзельніка ў групе», «Журнал заўваг і прапаноў», «Абраза»);
- ролевыя гульні (напрыклад, на тэму «Прэзентацыя менталітэту славяніна і еўрапейца»);
- дыскусіі (прыблізная тэматыка: «Забабоны, замовы, прыкметы: верыць ці не верыць?», «Язычніцтва – хрысціянства: хто мы?», «Нацыянальная самасвядомасць: ці так гэта важна ў эпоху глабалізацыі?»);
- рэфлексіі, накіраваныя на ўстанаўленне зваротнай сувязі са студэнтамі і ўключэнне іх у планаванне і арганізацыю практыкі праз: 1) працу ў малых групах над праектам «Мае чаканні – маі прапановы» (у плане прадметна-змястоўным, у плане дзейнасным, у плане эмацыянальным); 2) рэйтынг мерапрыемстваў і анкеты; 3) відовішчныя мерапрыемствы (напрыклад, Купальскі вечар, вечар народных гульняў, пасвяшчэнне ў фалькларысты, фольк-фэст)[2].

*Афармленне справаздачы і падвядзенне вынікаў фальклорнай практыкі*

1. Выніковая дакументацыя па практыцы афармляецца па пэўных крытэрыях і здаецца на праверку кіраўніку. Група прэзентуе свае запісы, робіць кароткі агляд па выніках уласных экспедыцый.

2. Ацэнка справаздачы практыкантаў кіраўніком, магчымасць выправіць памылкі ў вызначэнні жанраў і афармленні.

3. Удзел у працы фальклорнага форуму «Фальклор, час і мы», падрыхтоўка тэматычных газет па выніках правядзення ўласных экспедыцый (па жаданні)[3].

---

[2]Дадзеныя віды працы прайшлі неаднаразовую паспяховую апрабацыю падчас выязных фальклорных практык са студэнтамі філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (далей – ГрДУ імя Янкі Купалы) пад кіраўніцтвам дацэнта Л. В. Ярашэнка.

[3]Паспяхова апрабіравана на філалагічным факультэце БДУ.

4. Удзел у Фальклорным фэсце (самадзейным канцэрце) па выніках правядзення ўласных экспедыцый (па жаданні)[4].

5. Розныя творчыя заданні: падрыхтоўка эсэ аб выканаўцы, мінідаследаванне (у выглядзе навукова-папулярнага артыкула), стварэнне сцэнарыя вечарыны, трэнінга, дыскусіі (па жаданні)[5].

## ТЭМАТЫКА ПАЛЯВОЙ ПРАКТЫКІ

### Склад фальклорнай прозы

***Міфалагічная проза***

Міфалагічныя ўяўленні, якія тычацца вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі беларусаў, міфалагічнай семантыкі прыродных з’яў і стыхій. Па сутнасці, гэта не сюжэтныя аповеды, а тлумачэнні і апісанні. Персанажы вышэйшай міфалогіі: Дзіў, Бог, Род, Сварог, Дажбог, Пярун, Вялес, Мокаш, Лада, Ярыла, Белбог (Бялун), Чарнабог. Ніжэйшая міфалогія: апекуны зямнога жыцця (Лада, Дзявоя (Сава), Ярыла, Цёця, Ляля, Жыцень і Жытняя баба, Зюзя, Мароз, Шчадрэц); духі культурнай прасторы: (дамавік (хатнік), дамавуха, хут, змей, валасень, злыдні, кікімара, чур, хлеўнік, лазнік, палявік, спарышка і інш.); духі прыроды (лясун, купальскі дзядок, вадзянік, русалкі, сарэны (фараонкі), балотнік, багнік, кадук, лазавік, лойма (чарціха), хапун і інш.); насельнікі неба і паветра (грамаўніца, гарцук, паветрыкі); жыхары падземнага свету і пекла (ох, кладнік, жыжаль (зніч), чорт (д’ябал, сатана, бес, нячысты дух, Люцыпар), пякельнікі, прахі і інш.); шкоднікі (цмок, шатаны, паралікі, шэшкі, стрыга і інш.); нечысці (Баба Яга (Ягіня, Юга), ведзьмакі і чараўнікі, вупыр, ваўкалак, дзікія людзі); хваробы і насланні (Паморак, Ліхаманка (трасца), Халера, Чума (Мор), Воспа, начніца, Мара, падвей і інш.), смерць (Смерць,Марэна, Паляндра).

Міфалагізаваныя прыродныя стыхіі і з’явы. Тэмы: час – зямля – неба – свяцілы (сонца, поўня (месяц), зоркі, каметы) – стыхійныя бедствы і з’явы (навальніца, гром, град, маланка, віхура, засуха, паводка, землятрус, пажар) – расліны – жывёлы – птушкі.

***Каляндарна-святочная проза***

Існаванне каляндарна-святочнай прозы ў дзвюх формах – натуральнай і штучнай. У натуральным выглядзе яна ўяўляе сабой бытавы аповед у адказ на пытанне аднавяскоўца, што там было на Купаллі, як вадзілі Куста, ці калядавалі на іх вуліцы і г. д., або, напрыклад, эмацыянальнае выказванне наконт таго, што моладзь цяпер не так весяліцца, як раней (і далей расказваецца, як хадзілі на вячоркі, спраўлялі дажынкі, гулялі пасля шчадравання і г. д.). Звычайна ў гэтых аповедах фігуруюць канкрэтныя асобы, сітуацыі, згадваюцца канкрэтныя выпадкі, смешныя здарэнні, прыклады недарэчных паводзінаў і г. д. У штучным выглядзе каляндарна-святочная проза паўстае ў адказах на пытанні збіральнікаў.

---

[4]Паспяхова апрабіравана на філалагічным факультэце БДУ.

[5]Паспяхова апрабіравана на філалагічным факультэце ГрДУ імя Янкі Купалы.

**Зімовы цыкл земляробчага календара**: *проза калядна-навагодняга комплексу.* Асноўныя тэмы: абходныя шэсці калядоўшчыкаў і шчадроўнікаў, абрадавая трапеза падчас трох куццяў, абрадавыя гульні з элементамі пахавання і вяселля, варожбы аграрнага і шлюбнага характару. Прыкладныя назвы калядных прадстаўленнях і гульняў: «Яшчар», «Жаніцьба Цярэшкі», «Пава з павуком», «Каза», «Кабыла», «Цыганы», «Маланка», «Памярла наша Мальвіна», «Мядзведзь», «Пекчы ката», «Гульня ў нябожчыка», «Стукач», «Стук», «Сарві вішню», «Жаніць Бахара (Бахурку)», «Бахар», «Верабей», «Тры каралі», «Цары», «Шчодра», «Шчадрацы», «Падушачка», «Рэдзька», «Зязюля».

**Веснавы цыкл земляробчага календара**: *проза Масленічнага комплексу, проза перыяду Гукання вясны, проза перыяду Вялікадня, проза Юраўскага абрадавага комплексу, проза абрадава-святочнага комплексу ваджэння і пахавання стралы, проза Траецка-русальнага комплексу.*

Тэмы масленічнай прозы: масленічныя стравы (склад, што з імі рабілі) – чучала Масленіцы – масленічныя лялькі – масленічныя пераапрананні – склад пераапранутых персанажаў (напрыклад, «мужчыны», «старцы», «цыганы», «дзед», «поп» і інш.), іх выгляд, дэталі касцюмаў – хаджэнне пераапранутых па вуліцы, наведванне хат, песні і віншаванні – катанні з гор (іх сэнс) – катанні на канях (з якой мэтай) – ушанаванне маладых шлюбных пар (хто наведваў маладуху, што казалі і спявалі, што ў адказ рабіла маладуха, ці разувалі маладых, ці распраналі маладуху, ці вазілі яе на санках па вуліцы) – звычай «цягаць калодку» (якім чынам, што сабой уяўляла «калодка», каго прымушалі яе цягнуць, на каго накідвалі, каму прышпільвалі, хто і чым адкупляўся ад «калодкі», сэнс звычаю) – звычай «цягаць ступу» – жарты, свавольствы, сваркі пераапранутых, фрывольныя паводзіны, «самадзейная музыка» (што выкарыстоўвалі ў якасці музычных інструментаў) – звычай вазіць на санях бабу-павітуху, частаваць яе – разыгрыванне традыцыйных сцэнак (напрыклад, «пахаванне дзеда», «пахаванне бабы») – жаночыя вечарынкі з песнямі і танцамі – масленічныя вогнішчы (дзе іх распальвалі, што туды кідалі) – провады зімы і пачатак гукання вясны.

Мясцовыя асаблівасці Гукання вясны.

Празаічныя аповеды перыяду Вялікадня: Пасха і хаджэнне валачобнікаў.

Асноўныя тэмы Юраўскага абрадавага комплексу: жывёлагадоўчая (звычаі першага выгану жывёлы на пашу) і земляробчая (агледзіны нівы, хаджэнне на юр’еву расу, карагодны абход палёў).

Лакальны характар бытавання абрадава-святочнага комплексу ваджэння і пахавання стралы («Страла», «Стрылка», «Вадзіць стралу», «Пахаванне стралы», «Сула», «Вадзіць сулу»).

Склад прозы Траецка-русальнага комплексу: аповеды пра ваджэнне Куста (Пінскае Палессе і яго памежжа), Маі (Палессе, але хутчэй за ўсё Усходняе), ушанаванне бярозкі (усходняя частка Беларусі), провады русалкі (Гомельшчына). Проза абраду ваджэння Куста. Галоўныя структурныя моманты абраду: утварэнне Куста – абход двароў (часам поля) – шэсце з Кустам (часам ваджэнне карагодаў) – дзеянні з «вопраткай» Куста – гулянка ў абранай хаце або на вуліцы. Проза абраду провадаў русалкі: галоўныя

структурныя моманты русальнага абрадавага комплексу – выбар прыгожай дзяўчыны на ролю русалкі (месцамі да яе далучаецца маленькая дзяўчынка – дачка русалкі – і русалін – мужчына-праваднік) – провады русалкі ў жыта (часам з абраным ёю хлопцам) – выкананне праводных песень – мясцовыя міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з русалкай, якую праводзяць.

**Летні цыкл земляробчага календара**: *проза Купалля, проза жніва*.

Асноўныя тэмы купальскай прозы: мясцовыя назвы свята і звязаныя з ім уяўленні, прыкметы, перасцярогі – вогнішчы – атрыбутыка купальскага вогнішча – купальскія ведзьмы і іх выкрыванне – купальскае кумаўленне – уяўленні пра папараць-кветку – купальскія бясчынствы – купанне – «ігра» сонца. Аповеды пра зажынкі і дажынкі, даўнейшыя і цяперашнія. Звычай жніўнай талакі.

**Восеньскі цыкл земляробчага календара**: тэмы, звязаныя з восеньскімі абрадамі, звычаямі, фалькларызаванымі хрысціянскімі святамі і прысвяткамі. Значныя даты народнага календара: святы, звязаныя з ушанаваннем Божай Маці, Узвіжанне, восеньскія Дзяды (або Асяніны), дзень Параскевы Пятніцы, Кузьмы-Дзям’яна, Піліпаўка, з якой пачынаўся перадкалядны пост, і інш.

***Сямейна-абрадавая проза***

Сямейна-абрадавая проза – шырокі пласт народнай культуры, звязаны з радзінамі, хрэсьбінамі, вяселлем і пахаваннем.

**Радзіны.** Галоўныя тэмы: нараджэнне дзяцей – забароны пры цяжарнасці – прыёмы палягчэння родаў – роды і паводзіны прысутных –дзеянні з пупавінай і паследам («дзіцячым месцам») – правілы прыёму нованароджанага – першае купанне нованароджанага – імя нованароджанага – хрэсьбіны – хрэсьбінныя чыны – бабіна каша – падарункі і зычэнні – ушанаванне бабкі.

**Вяселле.** Асноўныя тэмы: пэўныя моманты вясельнай абраднасці, дзеянні вясельных чынаў, вясельныя атрыбуты, іх выраб і дзеянні з імі, вясельныя гульні і пераапрананні. Агульны сцэнарый вяселля і варыянтныя назвы яго этапаў. Лакальна-рэгіянальныя элементы вясельных абрадаў, якія адсутнічаюць у іншых мясцовасцях. *Мэта збіральніка* – запісаць складныя аповеды пра мясцовае вяселле, яго асобныя этапы, абрады і звычаі: даведкі, сватанне, запоіны, заручыны, суборная субота (вяночкі, паненскі вечар і г. д.), каравай, пасад (саджэнне на дзяжу, расплятанне касы, застрыганне, пакрыванне); прыезд дружыны маладога да маладой, розныя віды выкупаў, шлюб (вянчанне), пераезд да маладога, камора, пасаг, выпрабаванне маладой, падзел каравая, адорванне маладых; цыганы, пярэзвы і г. д.

**Пахаванне.** Асноўныя тэмы: рэгламентацыя паводзінаў на пахаванні, этапы пахавання ад дня смерці нябожчыка і да апускання труны ў магілу. Мясцовыя звычаі пахавання.

***Народна-хрысціянская проза***

Аповеды, якія тычацца народных уяўленняў пра Госпада Бога, Ісуса Хрыста, Божай Маці (Прачыстай), святых прападобных, хрысціянскія святы і звязаныя з імі агульнабеларускія і мясцовыя звычаі, прыкметы, павер'і, прыказкі, забароны, перасцярогі, дазволы і г. д. Нязвыклыя рысы і функцыі свяцiцеляў. Цяжкасці ў ідэнтыфікацыі святаў у мясцовай традыцыі (напрыклад, 15 лютага, вядомае як Грамніцы, Стрэчанне, у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці мае назву «Ровнэцэ». І толькі пасля аповеду можна здагадацца, якое агульнабеларускае народнае свята маецца на увазе).

**Народна-хрысціянскія святы**: Пракоп, Васіль, Іаан Хрысціцель, Аксіння, Таццяна, Апанас, Тры Свяціцелі, Трыфан, Валянцін, Аўлас, Збор (Ізбор), Аўдоцця Вясноўка, Аляксей Цёплы, Дар'я Вясенняя, Юрый (Юр'е), Аўсей, Барыс, Іван Веснавы, Мікола Веснавы, Алёна (Ульяна), Пятро і Паўла, Агрыпіна Купальніца, Кузьма і Дзям'ян, Андрэй, Ілля, Флор і Лаўр, Параскева Пятніца, Мікола Зімовы і інш. Звычаі, павер'і, прыкметы, забароны, звязаныя з такімі фальклaрызаванымі хрысціянскімі святамі і пастамі, як Піліпаўка, Раство, Вадохрышча, Стрэчанне (Грамніцы), Сорак пакутнікаў (Саракі), Дабравешчанне (Звеставанне), Вялікі Пост, Вербніца, Чысты чацвер, Пасха (Паска), Ушэсце, Тройца, Пятроўка, Дзявятнік і Дзявятуха, Дзясятнік і Дзясятуха, Казанская (градавы дзень), Спасаўка (пост) і Спасы (Макавей, Яблычны, Хлебны), Узвіжанне, Прачыстая, Пакровы (Трэцяя Прачыстая), Увядзенне і інш.

***Казкавая проза***

Жанравыя разнавіднасці казак: анімалістычныя казкі (або казкі пра жывёл), чарадзейна-фантастычныя, рэалістычныя (г. зн. жыццепадобныя), сярод якіх вылучаюцца авантурна-навелістычныя казкі пра прыгоды героя, бытавыя і сацыяльныя. Казкі з адметнай кампазіцыяй – кумулятыўныя (ланцужковыя з паўтарэннем ці нарошчваннем аналагічных дзеянняў ці эпізодаў) і дакучныя (бясконцыя або звышлаканічныя тыпу «Жылі у бабусі два гусі. Восьі казка ўся»).

***Няказкавая проза***

Класіфікацыя няказкавай прозы: легендарная, прымхлівая, рэалістычная, смехавая. *Жанравыя віды легендаў*:

а) міфалагічныя легенды з падзелам на касмаганічныя (пра стварэнне свету і яго асобных частак), заагенічныя (пра стварэнне і з'яўленне жывёл, птушак, насякомых, раслін), антрапагенічныя (пра паходжанне чалавека), эсхаталагічныя (пра канец свету ці яго частак);

б) гістарычныя легенды, у якіх падаюцца міфалагізаваныя звесткі аб этнічнай гісторыі беларусаў, іх паходжанні або аб паходжанні асобных груп (напрыклад, палешукоў і палевікоў), расказваецца аб першых насельніках беларускай зямлі, гістарычных падзеях мінулых часоў, ёсць указанні на гістарычных асоб, грамадскія адносіны і г. д.;

в) тапанімічныя легенды, звязаныя з геаграфіяй пэўнай мясцовасці, яе памятных ландшафтных аб'ектаў, з паходжаннем гарадоў, вёсак, азёраў, рэк, урочышчаў, курганоў і іх назваў. Тапанімічныя легенды адрозніваюцца ад

гістарычных па дамінантнай мэце: яны скіраваны на тое, каб даць гістарычнае або псеўдагістарычнае тлумачэнне паходжання назваў геаграфічных аб’ектаў;

г) маральна-этычныя легенды, галоўны матыў якіх – пакаранне за зло і ўзнагарода за дабро. Большая частка гэтых легенд развівалася ў рэчышчы народнай хрысціянскай культуры.

*Прымхліцы* як творы аб сутыкненні чалавека са светам звышнатуральнага, цудоўнага, цудадзейнага, незвычайнага, з тым, што раптам перапыняе натуральнае існаванне або вылучае нейкія з’явы, аб’екты, рэчы, прадметы з ліку звычайных, натуральных. Напрыклад, ёсць звычайныя людзі і ёсць ведзьмы, русалкі, дамавікі, лесуны, чараўнікі, варажбіты, ваўкалакі, звычайныя камяні і божыя, цудадзейныя, чортавы, звычайныя месцы і заклятыя.

*Бываліцы, апавяданні-ўспаміны ці мемуары* як жанры рэалістычнай прозы. Тэмы: падзеі недалёкага мінулага, якія адбыліся на памяці апошніх пакаленняў, тычацца ўсіх жыхароў вёскі або асобнай сям’і і яе членаў. Для нашага часу гэта гістарычныя падзеі XX стагоддзя, выпадкі, здарэнні, што былі з рэальнымі людзьмі. Яны могуць быць па-свойму цудоўнымі, незвычайнымі, фантастычнымі, прымхлівымі, але ў іх аснове палягае тое, што уразіла нашых сучаснікаў, падалося ім значным, істотным (напрыклад, факты цудоўных выратаванняў, здзейсненых прадказанняў, сноў, сутыкненні са сферай незвычайнага, што нядаўна ўвайшло ў свядомасць і знаходзіцца па-за сферай традыцыйна-міфалагічнага).

***Смехавая проза***

Жанры смехавай прозы: небыліцы, анекдатычныя казкі, анекдоты, жарты, досціпы (гумарэскі). Праявы своеасаблівасці нацыянальнага і мясцовага матэрыялу ў анекдотах. *Анекдот* як аднаэпізоднае апавяданне пра смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека ці ўчынак, якое мае неспадзяваную камічную развязку. *Рысы анекдатычных казак*: звычайна не абмяжоўваюцца адным эпізодам, імкнуцца да разгорнутасці, сюжэтнасці, «абрастання» трапнымі мастацкімі дэталямі.

*Аснова жарту* – смешнае здарэнне, дасціпная насмешка над паасобнымі рысамі і якасцямі людзей, яго найбольш папулярная форма – дыялог з нечаканай завяршальнай фразай. У адрозненне ад анекдота ў гумарэсцы можа адсутнічаць нечаканая камічная развязка. Незласлівасць і добразычлівасць насмешкі з прыватных з’яў як *характэрная рыса гумарэскі*.

***Магічная проза***

Магічная практыка бытавога характару, уяўленні аб выкананні пэўных дзеянняў, норм паводзінаў або, наадварот, іх пазбяганне, якія дапамогуць засцерагчыся ад магчымай небяспекі, ліквідаваць негатыўныя наступствы, паспрыяць надыходу жаданага. Класіфікацыя магічнай прозы: па функцыі магіі (засцерагальная, ахоўная, прадуцыравальная і г. д.), па тэматыцы прадметаў, якія выкарыстоўваліся ў магічных мэтах (хлеб, посуд, ткацкія вырабы, пража, адзенне, травы і г. д.). Традыцыйная сістэма каштоўнасцей: чалавек з боку яго стану, статуса, становішча (здаровы/хворы, нованароджаны, нявеста, парадзіха, жняя, жанчына/мужчына, падарожны і г. д.), яго маёмасць, свойская жывёла,

ураджай. Пры вербалізацыі ўяўленняў магічная проза набывае форму парад, патрабаванняў, тлумачэнняў, перасцярог, забарон, рэгламентацый, якія актуалізуюцца ў працэсе бытавой камунікацыі.

Хваробы, ад якіх трэба засцерагацца: барадаўка, крывацёк, ціск, звіх, выбой, удар, падвярот, зубны боль, зубішча, цемяннік, скула, рожа, залатуха, вогнік, астуда, жар, лішай («кругі»), валасень, грыжа («грызь»), залатнік («роды, выкідыш, маціца»), болі ў жываце, доннік, каўтун (каўтуніца), бяльмо, ячмень, хвароба вачэй, ліхаманка, хінцюха (хінця, цётка, варагуша, трасца), сурокі (зглаз, прыгавор, суроцы, стацце), нарадка, падучая, чорная хвароба, нязбытнік, падзіў, прыдзіў, прымаўка, прыстрэк, нагавор, сцень, падвей, ляк, спужанне, спуг, пярэпалах, упуд, зляк, начніцы, крыксы, плаксы, дзяцінец, радзімец, патайнік, сухоты, сухотнік, бязбытнік, боль (у розных месцах), нервы, раны, абвар, абжог, гарачка, кашаль, чума, касцяная балячка, колька, патніца, запор, ікаўка, пякота, туга, смутак, гора, нуда, запой, перапой, п’янства.

## Рытуальна-магічная сфера

***Замовы***

Складанасці ў запісах замоў. Класіфікацыя замоў: 1) замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор грыбоў, ягад, захаванне жывёлы, ураджаю); 2) замовы супраць хвароб (ліхаманка, зубны боль, пярэпалох, грыжа, сурокі, укус змяі, крывацячэнне, інш.); 3) замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (засцярогі ад напасці, смерці, злога духа, нячыстай сілы, нагавору ў час вяселля, нараджэння дзіцяці і г. д.); 4) замовы любоўнага прызначэння («прысушкі» і «адсушкі»); 5) замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі (супраць князёў, баяр, памешчыкаў, цароў, несправядлівых суддзяў, а таксама супраць вайны, супраць кулі на вайне і інш.).

***Каляндарна-абрадавая паэзія***

Геаграфія распаўсюджання каляндарна-абрадавай паэзіі

| Цыкл | Віды песень | Тэрыторыя бытавання |
| --- | --- | --- |
| зімовы | 1) калядныя і шчадроўскія<br>2) засявальныя<br>3) стрэчаньскія | 1) паўсюдна на Беларусі<br>2) Магілёўшчына<br>3) вядомы адзінкавыя прыклады (Касцюковіцкі раён, Віцебшчына) |
| веснавы | 1) масленічныя<br><br><br>2) вяснянкі<br>3) валачобныя<br><br><br>4) юраўскія<br>5) песні абраду «ваджэння» і пахавання стралы» | 1) Віцебшчына, Міншчына, Магілёўшчына, радзей – Гомельшчына;<br>2) паўсюдна на Беларусі;<br>3) Віцебшчына, Міншчына, Магілёўшчына, радзей – Гомельшчына;<br>4) паўсюдна на Беларусі;<br>5) Гомельшчына (Веткаўскі, Добрушскі, Гомельскі, Чачэр- |

| | | |
|---|---|---|
| | 6) траецкія<br>7) куставыя<br><br>8) русальныя | скі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Кармянскі, Хойніцкі, Брагінскі, Светлагорскі, Петрыкаўскі раёны); Берасцейшчына (Лунінецкі); Магілёўшчына (Бабруйскі); Міншчына (Барысаўскі, Мінскі раёны);<br>6) Магілёўшчына;<br>7) Пінскі раён Брэсцкай вобласці;<br>8) Гомельшчына (Веткаўскі, Добрушскі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Чачэрскі раёны). |
| летні | 1) купальскія<br>2) пятроўскія і касецкія<br><br>3) жніўныя | 1) паўсюдна на Беларусі;<br>2) Міншчына, Магілёўшчына, Гомельшчына, Берасцейшчына;<br>3) паўсюдна на Беларусі. |
| восеньскі | 1) ярынныя<br>2) ільняныя і канапельныя<br><br>3) збіральніцкія<br>4) талочныя<br>5) піліпаўскія | 1) Цэнтральная Беларусь<br>2) першыя – Паўночная Беларусь, Падзвінне, другія – Паўднёва-Усходняя Беларусь;<br>3) паўсюдна на Беларусі;<br>4) паўсюдна на Беларусі;<br>5) паўсюдна на Беларусі. |

***Паэзія сямейна-абрадавага комплексу***

Радзіны, хрэсьбіны, вяселле і пахаванне – пласт народнай творчасці, які ў большай ці меншай ступені вядомы кожнаму.

*Радзінна-хрэсьбінная паэзія*: асноўныя персанажы радзінных песень – парадзіха, дзіця, бабка, бацька дзіцяці. Жанравы склад хрэсьбінных песень: заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, бяседныя песні, зычэнні, тосты, прыгаворкі.

*Вясельная паэзія*: вясельныя песні, галашэнні, прыпеўкі, прыгаворкі, рацэі, зычэнні. Этнаграфічны і філалагічны крытэрыі класіфікацыі вясельных песень. Этнаграфічная класіфікацыя падзяляе творы вуснай народнай творчасці ў адпаведнасці з прымеркаванасцю да розных этапаў вяселля: песні сватання, песні заручын, песні зборнай суботы, каравайныя песні, песні пасада, песні пад час вяселля ў маладога, песні-пярэзвы і г. д. Філалагічная класіфікацыя вылучае сярод вясельных песень рытуальныя, заклінальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя), лірычныя.

*Пахавальна-памінальная паэзія*. Жанравы склад: плачы, хаўтурныя і памінальныя галашэнні, песні-псальмы. Складанасць запісаў галашэнняў – у іх

абумоўленасці абрадам і ў імправізацыйным характары. Адрозненне плачаў і галашэнняў.

## Карагодна-гульнёвыя і танцавальныя песні

Народныя тэрміны. Падпарадкаванасць руху. Мясцова адметныя карагоды, танцы, рытмы. Спецыфіка сюжэтнасці карагодных песень. Тыповыя структуры танцавальных песень: калектыўныя маналогі-звароты, дыялогі, прадстаўленні-апісанні.

## Малыя жанры беларускага фальклору

*Прыказкі, прымаўкі, загадкі, выслоўі*. Методыка запісу: фіксацыя твораў у кантэксце, адзначаючы, з якой нагоды яны згадваліся. Віды выслоўяў: скарагаворкі, застольныя жарты, прыгаворкі і тосты, вітанні, зычэнні, ветлівыя і ласкавыя звароты, прысяганні і бажба, праклёны і абзыванні-ганьбаванні, нават калі яны выражаны адным словам.

## Баладныя песні

Класіфікацыя баладных песень: міфалагічныя, гістарычныя, навелістычныя, балады з загадкамі. Адметнасць *міфалагічных балад*: асноўны матыў – метамарфоза гераіні-маці (дачкі, нявесткі, жонкі) у птушку (зязюлю, ластаўку, салавейку і інш.), радзей – у кветкі, дрэвы, каменні, рэчкі і інш. Разнавіднасці: *казачныя і легендарныя міфалагічныя балады*. Адметнасць першых: прысутнасць вобразаў дзікіх звяроў, якія шырока прадстаўлены ў казках (напрыклад, воўк, мядзведзь і інш.), другіх – наяўнасць хрысціянскіх сюжэтаў (самы распаўсюджаны – пра Юр’я і Цмока, пра дзеўку-дзетагубніцу, «жыційныя» (пра святую Алену і інш.).

Тэматыка *гістарычных балад*: татарскі (турэцкі) палон, трагічныя сустрэчы разлучаных членаў сям’і пасля палону, продаж у няволю, выкуп з няволі, згадкі пра ваенныя сутыкненні з татарамі, пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Тэмы *навелістычных балад*: сямейныя канфлікты, прыгоды і нягоды кахання, радзей – нешчаслівы лёс, драматычныя спаборніцтвы, небяспечныя прыгоды.

Асноўная сюжэтаўтваральная рыса *балад, якія змяшчаюць загадкі,* – выпрабаванне загадкамі-пытаннямі. У іх лаканічна падаюцца драматычныя моманты ў жыцці чалавека падчас абрадавага ці выпадковага выпрабавання іх лёсу, якія могуць заканчвацца нават трагічна.

Класічная фальклорная балада і балады літаратурнага паходжання, беларускія апрацоўкі сюжэтаў вядомых рускіх балад.

## Духоўныя вершы і псальмы

*Духоўныя вершы* – (народная назва – песні старэцкія) як творы эпічнага і ліра-эпічнага характару на хрысціянскія сюжэты, матывы і вобразы

(выконваліся аднагалосна ў пазалітургічных абставінах). Запісаць іх можна ад хрысціян праваслаўнага веравызнання. Духоўныя вершы маюць наступныя тэматычныя разнавіднасці: 1) вершы пра Галубіную кнігу з яе апавяданнем пра першапачаткі Сусвету, стварэнне зямной іерархічнай сістэмы і барацьбу Праўды і Крыўды, вынік якой прадвызначыў лёс усяго чалавецтва; 2) вершы на старазапаветныя і евангельскія тэмы; 3) вершы пра святых і вялікамучанікаў; 4) вершы аб падзвіжніках і праведніках; 5) вершы пра Пятніцу; 6) вершы пра жабрацкую брацію; 7) стараверскія і сектанцкія вершы.

*Псальмы* як вусна-паэтычныя творы на хрысціянскія тэмы, запісаць якія можна ад паслядоўнікаў каталіцкага і пратэстанцкага веравызнання на рускай, польскай ці беларускай мовах.

## Пазаабрадавая лірыка

Праблема класіфікацыі пазаабрадавай лірыкі. Склад *бытавых песень*: *любоўныя* (прысвечаны тэме кахання – шчаслівага, нешчаслівага, ідэальнага і г. д.), *элегічныя* (суб’ект перажывання (хлопец, дзяўчына) не прадстаўлены, акцэнт змешчаны на апісанні прыроды (пейзажныя малюнкі), радзей – на інтэр’ер хаты, у іх перадаецца агульны характар перажывання), *сямейныя* (распрацоўваюць тэмы сямейнага дэспатызму і жаночай долі). Асноўныя матывы – сум па роднай хаце і бацьках (праз успаміны і звароты да братоў і родных), скаргі, слёзы і праклёны прыгнечанай нявесткі, папрокі зяцю ад цешчы і г. д.), *сіроцкія іўдовіныя* (прысвечаны тэме няшчаснага, складанага лёсу дзяцей і ўдавы пасля страты бацькоў і мужа. Для іх характэрны матывы скаргаў на долю, слёз, пакут у перадачы шчымлівага болю, зварты да памерлых, долі, Бога), *прымацкія* творы, звязаныя з пазаабрадавай сферай жыцця чалавека.

Склад *сацыяльных песень*: падзяляюцца на *рэкруцкія* (пра сялянскіх хлопцаў, якіх забіралі ад родных сем’яў амаль у пажыццёвае рэкруцтва – службу ў імператарскай арміі), *салдацкія* (пра парадкі і складанасці вайсковай службы і г. д.), *казацкія* (тэмы – адыход казака на службу і на вайну, развітанне казака з жонкай, маці, нявестай, казацкі паход, смерць казака на полі бою, вяртанне дадому і г. д.), *антыпрыгонніцкія* (пра панскі прыгнёт і несправядлівыя адносіны да селяніна), *батрацкія і бурлацкія* (пра цяжкую вымушаную працу ў наймальніка), *чумацкія* (пра людзей, якія займаліся рознымі заробкамі, у асноўным перавозкай солі і рыбы), *турэмныя*. Мастацкая прэзентацыя сацыяльнай прыналежнасці герояў і таго асяроддзя, у якім яны дзейнічаюць, як вызначальная рыса сацыяльных песень.

*Гумарыстычныя і сатырычныя песні.* Асноўныя тэмы: сямейна-бытавыя адносіны, маральныя заганы пануючых класаў грамадства і звычайных людзей, узаемныя кпіны дзяўчат і хлопцаў, кума і кумы, жартоўныя спрэчкі жонкі і мужа, дзеда і бабы, зяця і цешчы, камічныя супярэчнасці ў сям’і, недарэчныя ўчынкі, алагічныя сітуацыі, небыліцы пра жывёл і птушак, неверагодныя гісторыі і многае іншае.

*Жорсткі раманс.* Спецыфіка жанру – узнаўленне псіхалогіі маргінальнага асяроддзя, свету яго каштоўнасцей, невырашальны характар канфлікту, які

абумоўлены дэградацыяй маральнага стану грамадства. Народная назва – «жаласлівыя песні».

*Прыпеўкі*. Прадуктыўнасць жанру. Іх вызначальныя паэтычныя рысы – лаканічная чатырохрадковая форма, наяўнасць рыфмы і харэічнага метру, здольнасць хутка, дасціпна і з гумарам адгукацца на любыя змены ў грамадстве, побыце і прыватным жыцці чалавека.

**Народна-драматычнае мастацтва**

Віды: драматургія фальклорна-этнаграфічных комплексаў, драматургія хрысціннай і вясельнай абраднасцей; драматургія маладзёжных і дзіцячых гульняў; тэатральна-драматызаваныя прадстаўленні ўсенародных гулянняў; батлейка, інтэрмедыі, народная драма.

Фальклорна-этнаграфічныя комплексы: Каляды, комплекс Масленічнага тыдня, Ваджэнне Куста, Ваджэнне стралы, Сёмушны тыдзень, Русальны тыдзень, Купалле. Рытуальныя і сацыяльныя ролі выканаўцаў абрадаў, песень, танцаў, гульняў, карагодаў. Фіксацыя асаблівасцей паводзінаў, адзення, абставінаў правядзення пэўных прылюдных мерапрыемстваў і прадстаўленняў.

**Сфера дзіцячага фальклору**

Фальклор для дзяцей і ўласна дзіцячая творчасць. Крыніцы дзіцячага фальклору. Жанравы склад і прынцыпы класіфікацыі дзіцячага фальклору. Вершаваныя і празаічныя, гульнёвыя і негульнёвыя жанры.

***Фальклор для дзяцей.*** Калыханкі. Гульнёвыя жанры (рухомыя і слоўныя): забаўлянкі, паскакушкі, прыгаворкі, небыліцы-перакруткі, скорагаворкі і інш. Загадкі, казкі, песні для дзіцячай аўдыторыі. Песні аб падзеях у жывёльным свеце. Мадэль перавёрнутага свету ў песнях-небыліцах. Цыклічная пабудова тэксту ў дакучных песнях і казках.

***Уласна дзіцячы фальклор***. Узроставая дыферэнцыяцыя розных жанраў. Спосаб перадачы. Паэзія гульнёвай культуры. Гульні-дзеянні і гульні мастацка-драматычнага ладу. Перадгульнёвы фальклор: жараб'ёўкі і лічылкі. Гульні. Гульнёвыя прыгаворкі і прыпеўкі. Слоўныя гульні. Дражнілкі, мірылкі, хітрыкі (выкруты), адгаворкі, іх роля ў рэгуляванні паводзінаў дзяцей у калектыве. Песні-заклічкі. Іх магічная форма і кола адрасатаў.

## Сучасны гарадскі фальклор[6]

Сучасны гарадскі фальклор як вобласць мастацкай творчасці буйных і малых гарадоў. Склад сучаснага гарадскога фальклору: традыцыйныя жанры фальклору, адаптаваныя ў сучасным гарадскім ужытку; уласна-гарадскія тэксты, якія распаўсюджваюцца ў дзвюх формах – *вуснай і пісьмовай*.

***Вусныя формы ўласна-гарадскога фальклору***:

1) гарадскі абрадавы фальклор (датычыцца грамадскага і хатняга побыту):

– *грамадскі побыт*: паэзія адноўленых каляндарных традыцый, сучасных святаў, выпускных вечароў, вечароў сустрэч, «пасвяшчальных» абрадаў (у салдат тэрміновай службы, студэнтаў, крымінальнікаў, альпіністаў, турыстаў) і інш.;

– *хатні побыт*: рэпертуар сучаснага застолля, вяселля, хрысцінаў, пахавання, провадаў на тэрміновую службу;

2) гарадская фальклорная проза (гарадскія былічкі, бывальшчыны, мемараты, легенды, міфы, чуткі, плёткі, байкі, анекдоты);

3) малыя формы фальклору (прыказкі і прымаўкі, сучасныя маладзёжныя выслоўі);

4) гарадская фальклорная паэзія (гарадскія рамансы, новыя балады, песні (бытавыя, ваенныя, палітычныя, песні-пародыі), крычалкі; выразы, прыгаворкі (застольныя, картачныя, стадыённыя, дзіцячыя);

5) фальклор гарадскіх субкультур:

5.1. полаўзроставай:

5.1.1. уласна дзіцячага і падлеткавага асяроддзя: аўтарскія калыханкі, пацешкі і пястушкі, сучасныя нескладухі, недарэчнасці, лічылкі і гульнёвыя прыгаворкі, апісанні новых гульняў, дражнілкі (мянушкі, абзыванні), сучасныя загадкі-жарты, «садысцкія» вершыкі, страшылкі, школьныя пародыі, школьны тлумачальны слоўнік;

5.1.2. маладзёжнага асяроддзя:

5.1.2.1. *студэнцкай субкультуры*: «стэб», кіч; анекдоты, афарызмы, жарты, тосты, песні, клятвы, легенды, «малітвы», розыгрышы;

5.1.2.2. *салдацкай (армейскай, курсанцкай) субкультуры*: павер’і, тосты, «маразмы», песні, скабрэзная паэзія, афарызмы, лірычныя мініяцюры, анекдоты;

5.2. прафесійна-карпаратыўнай:

5.2.1. уласна прафесійнай (*МНСаўскай, рабочай, медыцынскай (бальнічнай*): парэміі (прыказкі, прымаўкі, выслоўі), розыгрышы, запаведзі, байкі, анекдоты, прыкметы, прыпеўкі і інш.);

5.2.2. *камп’ютарнай* (якія трансліруюцца як у сетцы Інтэрнэт, так і ў асяроддзі праграмістаў-камп’ютаршчыкаў): прыказкі, прымаўкі, афарызмы,

---

[6] У гэтым раздзеле прадстаўлена класіфікацыя відаў і жанраў сучаснага гарадскога фальклору, распрацаваная фалькларыстамі БДУ В. В. Прыемка і Т. А. Марозавай на аснове фальклорных запісаў, якія захоўваюцца ў рэгіянальным архіве Вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ. Адпаведна яна можа быць удакладнена з’яўленнем новых запісаў або скарэкціравана наяўнасцю запісаў, якія захоўваюцца ў іншых архівах фальклорнай творчасці.

творы-квінтэсенцыі «народнай камп’ютарнай мудрасці», смехавыя формы (жарты, пытанні-загадкі, пародыі на парады (або дрэнныя парады), анекдоты), малітвы праграмістаў і малітвы юзераў (звычайных карыстальнікаў камп’ютара);

5.2.3. *блатной (крымінальнай)*: «прыколы», анекдоты ў форме прыколаў-«загадак», фальклорная проза (міфалагічныя апавяданні, парнаграфічныя апавяданні, легенды, прадказанні, гаданні, пераказы сноў), паэзія (балады, лірычныя песні), афарызмы, прыказкі, клятвы, праклёны;

5.3. вольна-часавай:

5.3.1. *фанацкай*: крычалкі і рачоўкі, эпіграмы, тосты, абрады, песні-пераробкі, прыгаворкі, пасвячэнні;

5.3.2. *турысцкай*: наратыўныя сюжэты (вусныя апавяданні, міфалагічныя тэксты) і ўмоўна-рытуальныя дзеянні (перасцярогі, збароны, правілы, малітвы, прыкметы пра надвор’е), розыгрышы, анекдоты, песні;

5.3.3. *парашутысцкай*: анекдоты, апавяданнямі аб скачках, якія запомніліся, аб смешных і кур’ёзных выпадках, парэміі, прыкметы, рытуалы святкавання юбілейных скачкоў (першага, трэцяга, пацідзесятага, сотага, двухсотага і так да тысячнага);

5.3.4. *геймерска-хакерскай*: знаходзіцца на памежжы прафесійнай і вольначасавай субкультур, уключае жанры кампьютарнай субкультуры (гл. вышэй);

5.4. рэлігійнай:

5.4.1. *хрысціянскай (праваслаўнай, каталіцкай, розных напрамкаў пратэстанцкай, сярод якіх вядучая роля належыць баптысцкай)*: жанры прыхрамавага асяроддзя – малітвы (не ўласна кананічныя, а ствараемыя самімі вернікамі і атрымаўшыя «хаджэнне» ў народзе), рэлігійныя песні, рэалістычныя аповеды і бываліцы, сярод якіх асобнае месца займаюць творы аб паломніцтве ў святыя мясціны, выгнанні бесаў і цуды;

5.4.2. *іўдзейскай*: малітвы, рэлігійныя песні, творы аб паломніцтве ў святыя мясціны, кодэкс забарон;

5.4.3. *мусульманскай*: малітвы, творы аб паломніцтве ў святыя мясціны, кодэкс забарон.

***Пісьмовыя формы***:

1) рукапісныя і друкаваныя песеннікі;

2) альбомныя вершы, паэмы і апавяданні (турэмныя, дэмбельскія, школьныя, дзявоцкія);

3) вершаваныя подпісы (да фотаздымкаў, паштовак, лістоў);

4) графіці;

5) «святыя лісты» і «лісты шчасця» – рукапісныя, друкаваныя, Інтэрнэт-лісты;

6) Інтэрнэт-фальклор.

## II. ПРАКТЫКА Ў АРХІВЕ ПРЫ КАФЕДРЫ, ЯКАЯ АДКАЗВАЕ ЗА ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЮ (на прыкладзе Вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ)

Роля Вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ў арганізацыі і правядзенні фальклорнай практыкі на філалагічным факультэце БДУ. Напрамак дзейнасці – практычнае азнаямленне студэнтаў першых курсаў з працай у архівах лабараторыі, падрыхтоўкай да практыкі ў палявых умовах, методыкай афармлення справаздач па фальклорнай практыцы, распрацоўкі вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

### Этапы правядзення фальклорнай практыкі ў лабараторыі са студэнтамі стацыянара

*Падрыхтоўка студэнтаў да работы ў лабараторыі:*

- наведванне лабараторыі падчас кансультацый;
- знаёмства з матэрыяламі рэгіянальнага, жанравага, аўдыя- і відэаархіваў, а таксама архіва іншых народаў свету;
- знаёмства з відамі і формамі работы, якія будуць прапаноўвацца студэнтам падчас практыкі.

*Падрыхтоўчы этап у выкананні супрацоўнікаў лабараторыі*: устанаўленне аб’ёму работ. Методыка: суміраванне інфармацыі аб стане спраў у кожным з архіваў лабараторыі.

***Рэгіянальны архіў***: прагляд супрацоўнікамі лабараторыі кожнай папкі з фальклорна-этнаграфічнымі матэрыяламі з мэтай іх сістэматызацыі, выяўлення фальсіфікаваных твораў, стварэння тапаграфічнага каталога, каталога збіральнікаў і каталога выканаўцаў, спісання чарнавых запісаў; пошук інфармацыі пра вёску, збіральніка і год запісу, фарміраванне папак па гадах экспедыцый і ўстанаўленне парадкавага нумару папкі.

***Жанравы архіў***: прагляд матэрыялаў пэўнага віду і жанру з боку выпрацоўкі крытэрыяў іх унутрыжанравай класіфікацыі, праверка ўсяго масіву тэкстаў аднаго жанру на наяўнасць правільнага вызначэння жанру.

***Аўдыя- і відэаархівы***: магчыма працаваць толькі з выбранымі студэнтамі, якія валодаюць сучаснымі электроннымі сродкамі апрацоўкі стужкавых бабін і касет, а таксама камп’ютарнай тэхнікай (сканерам, спецыяльнымі праграмамі). Адбор матэрыялаў для алічбоўкі, сканіравання пашпартоў, стварэнне пашпартоў для аналагавых касет, уніфікацыя афармлення аўдыя- і відэакасет з фальклорнымі запісамі апошніх гадоў – задача спецыялістаў лабараторыі.

Праца ў камп’ютарных класах – вырашэнне праблемы камп’ютарызацыі архіўных фондаў лабараторыі, увядзенне іх у глабальную сетку Інтэрнэт і інш.; прагляд усіх архіўных фондаў, выяўленне матэрыялаў, якія патрабуюць хуткага перанясення ў камп’ютарны варыянт, выпрацоўка правілаў камп’ютарнага афармлення, падрыхтоўка базы дадзеных для электроннага архіва лабараторыі; праца з алічбаванымі аўдыя- і відэазапісамі.

*Этап непасрэднай работы студэнтаў у лабараторыі*

Віды работы:

у рэгіянальным архіве: *складанне рэестравых ведамасцей пэўнай вобласці.* Сутнасць работы: студэнт поўнасцю праглядае матэрыялы кожнага сшытка ў папцы, сістэматызуючы матэрыялы па відах і жанрах, вызначаючы жанры, калі яны не вызначаны (з дапамогай кіраўніка). Пасля складае рэестравую ведамасць па наступных пунктах: нумар папкі, год экспедыцыі, населены пункт, віды і жанры фальклору, інфармант, збіральнік. Пры гэтым ажыццяўляецца падлік колькасці адзінак па кожным жанры і агульная колькасць фальклорных твораў, запісаных у пэўнай вёсцы;

у жанравым архіве: *разбор картак па тэматычным прынцыпе, функцыянальным і г. д.* Самастойна студэнты могуць ажыццяўляць тэхнічныя і навуковыя віды работы: *размяркоўваць карткі пэўнага жанру па адпаведных скрынях у шафах, праводзіць адбор варыянтаў аднаго і таго ж твора, весці ўлік рэгіянальнага распаўсюджання варыянтаў аднаго твора*;

у бабінным аўдыяархіве: *праслухоўванне бабінных запісаў, маркіраванне матэрыялаў дрэннаякаснага гучання, алічбоўка бабінных запісаў, сканіраванне пашпартоў бабін і іх сістэматызацыя ў праграме «Excel»*;

у камп’ютарным класе: *тэхнічны набор неабходнай інфармацыі,* напрыклад, *інвентарызацыйных ведамасцей паступлення матэрыялаў у лабараторыю; нефарматных картак з фальклорнымі адзінкамі для шафаў жанравага архіва ў праграме «Word»; рэестравых ведамасцей фальклорных матэрыялаў рэгіянальнага архіва ў праграме «Excel»; састарэлых матэрыялаў для рэгіянальнага архіва*; *праца па праслухоўванні алічбаваных матэрыялаў бабіннага аўдыяархіва, разразанне песень на трэкі.* **Вызначэнне жанру алічбаваных разрэзаных песень – задача супрацоўнікаў лабараторыі.**

*Афармленне справаздачы і падвядзенне вынікаў фальклорнай практыкі*

1. Афармляецца і здаецца на праверку кіраўніку дзённік назіранняў па днях практыкі. Група прэзентуе свае запісы, робіць кароткі агляд па выніках ўласнайпрацы.

2. Ацэнка працы практыкантаў кіраўніком.

3. Удзел у працы фальклорнага форума «Фальклор, час і мы», падрыхтоўка тэматычных газет па выніках працы ў архіве (па жаданні).

4. Удзел у Фальклорным фэсце (самадзейным канцэрце) па выніках працы ў архіве (па жаданні).

**Этапы правядзення фальклорнай практыкі ў лабараторыі са студэнтамі завочнай формы навучання**

*Падрыхтоўчы этап*

1) знаёмства з архівамі лабараторыі (2 г. на групу);

2) правядзенне майстар-класаў па вызначэнні жанру фальклорнага твора (2 г. на групу);

3) індывідуальныя кансультацыі (пастаянна па меры звароту).

*Уласна практыка ў лабараторыі*

1) складанне інвентарызацыйных ведамасцей уліку матэрыялаў з вызначэннем жанраў (рэгіянальны архіў);

2) рэтраканверсія (перанос рукапісных матэрыялаў у электронны фармат);

3) разразанне алічбаваных песень на трэкі;

4) іншая праца ў архівах (па вызначэнні супрацоўнікаў лабараторыі).

*Альтэрнатыўная форма практыкі – творчая.* Віды:

❖ падрыхтаваць ілюстраваны прыкладамі альбом па фальклору пэўнай мясцовасці (з фатаздымкамі выканаўцаў, вёскі, прадметамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва), можна ў выглядзе прэзентацыі; аформіць інфармацыю пра сябе як пра аўтара;

❖ зрабіць сваімі рукамі любы твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, звязаць яго з фальклорам (казкавы або песенны матыў ці сюжэт, парэміі, анекдоты, замовы і інш.), аформіць інфармацыю пра сябе як пра аўтара;

❖ прывезці з пэўнай мясцовасці любы артэфакт традыцыйнай беларускай культуры (ад адзення да прадметаў побыту і культуры) з абавязковым партфоліа дарыцеля: яго біяграфіяй (асноўныя вехі), апісаннем гісторыі з’яўлення артэфакта ў сям’і і моманту дарэння, прадстаўленнем адпаведных фатаздымкаў ці малюнкаў; аформіць інфармацыю пра сябе як збіральніка – пасрэдніка дарыцеля.

Творчая форма практыкі ацэньваецца вышэйшым балам – «10».

## III. ПРАКТЫКА ПА ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ПРАГРАМЕ

Фальклорная практыка студэнтаў-замежнікаў філалагічнага факультэта з’яўляецца неад’емнай часткай вучэбнага працэсу, але мае свае асаблівасці. Яна праводзіцца па індывідуальнай праграме, а яе змест залежыць ад месца жыхарства (горад ці правінцыя, з якіх прыехаў студэнт-замежнік).

*Студэнты-замежнікі з правінцыі* збіраюць нацыянальны фальклор і афармляюць справаздачу ў адпаведнасці з агульнымі патрабаваннямі. Збіранне фальклору свайго народа пашырае і паглыбляе веды студэнтаў-замежнікаў, атрыманыя на лекцыйных і практычных занятках, знаёміць з жывым бытаваннем твораў вуснай народнай творчасці, дазваляе глыбей спасцігнуць

спецыфіку ўласнага фальклору, знаходзіць агульнае і адметнае ў фальклоры розных народаў.

Арганізацыйна-метадычную работу па падрыхтоўцы студэнтаў-замежнікаў да практыкі ажыццяўляе кафедра, якая забяспечвае выкладанне дысцыпліны «фальклярыстыка» на філалагічным факультэце, і кіраўнікі груп.

**Падрыхтоўчы этап**: вызначэнне месца праходжання практыкі, заняткі па методыцы збірання, запісу і афармленню матэрыялаў практыкі, знаёмства з працай архіваў пры кафедры, правядзенне групавых і індывідуальных кансультацый.

**Выканаўчы этап**: пры індывідульным праходжанні практыкі студэнты разам з кіраўнікам распрацоўваюць заданні з улікам мясцовых і нацыянальных асаблівасцей фальклору. Увага акцэнтуецца на правілах збірання фальклору па распрацаваным апытальніку, аналізе і вызначэнні жанравай прыналежнасці твораў з улікам тыпалагічных рысаў беларускага, рускага і іншанацыянальнага фальклору. Студэнты вучацца аналізаваць вусную народную творчасць свайго народа ў параўнальным аспекце, выяўляць спецыфічныя з’явы, характэрныя для іх традыцыйнай культуры ў дачыненні да асаблівасцей вусна-паэтычнай творчасці беларускага і рускага народаў.

Фальклорная практыка *студэнтаў-замежнікаў гараджан* складаецца з трох частак:

1. Падрыхтоўка матэрыялаў па тэме «Месца і роля фальклору ў культуры сучаснага горада», прычым у дадзеным выпадку тэрмін «фальклор» разумееца ў шырокім значэнні.
2. Паглыбленне ведаў пра нацыянальную фальклярыстыку (аналіз зборнікаў і даследаванняў).
3. Збор матэрыялаў па абранай тэме (у параўнальным аспекце).

*Альтэрнатыўная форма практыкі – творчая (гл. с. 25),* якая ацэньваецца вышэйшым балам – «10».

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПРАВІЛЫ ЗАПІСУ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ

Правілы запісу фальклорных твораў вызначаюцца тэксталогіяй фальклору і маюць на ўвазе выкананне наступных патрабаванняў:

- ❖ рукапісны запіс павінны ажыццяўляцца непасрэдна ў момант выканання, «з голасу»;
- ❖ расшыфроўкай аўдыязапісаў неабходна займацца адразу ж пасля вяртання на базу;
- ❖ прытрымлівацца дакладнасці: не дапускаць ніякіх зменаў і падмены слоў; захоўваць фанетычныя асаблівасці і сінтаксічны лад мовы, дыялектызмы, устаўныя галосныя і зычныя гукі, націскі, якія не адпавядаюць нормам літаратурнай мовы (адсутнасць націску можа сказіць рытм твора), асаблівасці дыялекту – «аканне», «оканне» і інш. – павінны быць адзначаны ў каментарыях да тэксту;

❖ абавязкова фіксаваць рэмаркі выканаўцы, якія змяшчаюць тлумачэнні асобных матываў, эпізодаў і прадметаў;

❖ калі ў момант выканання запісаць тэкст няма ніякай магчымасці, то збіральнік павінен узнавіць пачуты ім твор па памяці. Тэкст запісу ў такім выпадку павінен суправаджацца ўказаннямі на тое, што тэксты ўзноўлены па памяці;

❖ праяўляць вытрымку, тактоўнасць, проста і зразумела тлумачыць субяседнікам сэнс і значэнне сваёй працы, пазбягаць выкарыстання спецыяльнай тэрміналогіі;

❖ пры гутарцы з рознымі выканаўцамі неабходна рабіць адзнакі пра час, месца запісу, кароткія характарыстыкі выканаўцаў, якія пасля неабходна адлюстраваць у дзённіку;

❖ каб паскорыць працэс рукапіснага запісу, можна падкрэсліваць радкі і словы, якія паўтараюцца (яны падкрэсліваюцца столькі разоў, колькі паўтараюцца ў тэксце), страфы і рэфрэны, якія паўтараюцца, пазначаць лічбай і літарай «р» (напрыклад, «2 р.»); пасля, у чыставіку, ад гэтага неабходна пазбавіцца і запісаць тэкст твора дакладна;

❖ перапісваць тэксты на чыставік пажадана ў дзень запісу;

❖ песні неабходна запісваць толькі падчас выканання, а не з пераказу, таму што пры спяванні яны ўзнаўляюцца дакладна, з усімі паўторамі і асаблівасцямі шматгалосся;

❖ пры запісе песні правільна вызначаць яе страфічную форму;

❖ пра парэміі не трэба пытацца прама: прымаўкі, праказкі і інш. могуць быць выяўлены з маўлення субяседніка (прыказкі заўсёды гаворацца да месца);

❖ пры запісе размовы на відэакамеру, тэлефон або смартфон пажадана выкарыстоўваць метад сузірання, адлюстравання. Гэта свайго роду «назіральніцкае кіно» (ці рэпартажнае), якое мае на ўвазе пазіцыю аўтара «за кадрам», ніверліраванне яго пазіцыі, голасу, адсутнасць якіх-небудзь каментарыяў. У кадры – толькі выканаўца. Аднак, таксама як і пры запісе на аўдыяносьбіт, перад фіксацыяй неабходна назваць твор і ўказаць, хто яго выконвае (не толькі прозвішча, імя і імя па бацьку, але і год яго нараджэння, нацыянальнасць, мясцовы ці не, адкуль прыехаў, калі немясцовы). Калі на гэта няма часу ў момант запісу, гэту інфармацыю неабходна ўказаць пасля фіксацыі твора.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ПРАКТЫКІ

### 1. ПРАВІЛЫ АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧЫ ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ

Студэнты рыхтуюць справаздачу ў электронным выглядзе, змяшчаючы ў кардонную папку з завязкамі дыск або флэш-накапляльнік і раздрукаваныя складнікі дыску або флэш-накапляльніка.

Склад справаздачы:

1. Тытульны ліст.
2. Спіс фальклорных твораў па жанрах (справаздачны мінімум – 50 адзінак фальклорнай прозы).
3. Дзённік назіранняў, напрыканцы якога абавязкова змяшчаюцца асабістыя ўражанні ад праходжання фальклорнай практыкі, а таксама (па жаданні) прыводзяцца прапановы па ўдасканаленню падрыхтоўчага і выканаўчага этапаў практыкі.
4. Рэестравая ведамасць уліку матэрыялаў з размеркаваннем твораў па жанрах і жанравых разнавіднасцях і абавязковым падлікам твораў кожнага жанру, а таксама агульнай колькасці зафіксаваных у пэўным населеным пункце твораў.
5. Файл «База дадзеных пэўнага населенага пункта».
6. Картка інфарманта з указаннем, колькі твораў якога жанру ад яго запісана.

**Увага!** *Колькі інфармантаў апытваецца, столькі і картак інфармантаў павінна быць у справаздачы.*

7. Аўдыя- і відэазапісы, зафіксаваныя на дыску або флэшцы, размяшчаюцца ў асобна створанай на гэтых носьбітах папцы з адпаведным подпісам «Аўдыязапісы» і «Відэазапісы» з асобным файлам, у якім змяшчаецца вопіс твораў да аўдыя- і відэазапісаў.
8. Фота (па жаданні збіральніка).

## ТЭХНІЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧЫ

Стыль электроннаганаборусправаздачы:

1) кегль 14, шрыфт Times New Roman;

2) параметры старонкі: злева – 3 см., зверху і знізу – 2 см., справа – 1,5 см; фармат старонкі – кніжная; абзац – 1,25 см.; інтэрвал – адзінарны; водступы злева і справа – 0; інтэрвалы «перад» і «пасля» – 0.

3) інфармацыя па днях запісу ў дзённіку павінна быць суцэльная, г. зн. разрывы старонкі ўстаўляць у тэкст НЕЛЬГА;

4) забараняецца:

- выкарыстоўваць розныя шрыфты і кеглі;
- рабіць падкрэсліванні, вылучэнні тлустым і курсіў;
- выкарыстоўваць аўтаматычную нумарацыю твораў;
- пакідаць «лішнія» прабелы ў тэксце;

•карыстацца прабеламі і табуляцыяй замест выраўноўвання тэксту з дапамогай меню старонкі «Галоўная» ў праграме «Word» пры ўтварэнні абзаца і размяшчэнні твораў;

5) выкарыстаць функцыю «разрыў старонкі» можна толькі пасля інфармацыі на тытульным лісце дзённіка, перад зместам і карткамі.

1. ***Афармленне тытульнага ліста вокладкі папкі.*** На папку прыклейваецца падпісаны пэўным чынам аркуш паперы.

*Узор*:

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Назва вну
Філалагічны факультэт

Назва кафедры
Назва лабараторыі або кабінета, пры якіх захоўваецца архіў

ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА
Студэнта I курса спецыяльнасці «беларуская (руская – *пакінуць патрэбнае*) філалогія»
Прозвішча, імя, імя па бацьку

Месцы запісаў: назва вёскі/пасёлка/горада, раён, вобласць (*падрабязна пазначайце ўсе адміністрацыйныя адзінкі, калі матэрыялы запісаны ў некалькіх раёнах і абласцях*), напрыклад:
*г. Пінск;*
*в. Камень Пінскага раёна Брэсцкай вобласці;*
*в. Багданаўка Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці).*
Колькасць адзінак (агульная)
Час: 14 дзён (напрыклад, *з 17 ліпеня да 2 жніўня 2018 г.*).
Кіраўнік: прозвішча, ініцыялы.

Горад, у якім функцыянуе вну
Год

2. ***Спіс фальклорных твораў па жанрах*** з указаннем колькасці зафіксаваных адзінак наклейваецца на адваротны бок вокладкі папкі.

*Узор*:

Спіс фальклорных твораў па жанрах
Фальклорная проза:
каляндарна-святочная – 13 адказаў на пытанні, з іх:
– пра Гуканне вясны – 3;
– пра жніво(дажынкі) – 7;
– восеньскія дакопкі – 3.
Сучасны гарадскі фальклор – 22 адзінкі, у яго складзе:
– гарадскіялегенды – 10;
– мемараты – 12.
Усяго – 50 адзінак.

3. ***Фальклорны дзённік***, афармлены па днях праходжання практыкі.

Склад дзённіка: тытульная старонка, кожнадзённыя запісы назіранняў і запісы твораў, нумарацыя старонак, змест па жанрах з указаннем назвы твора і старонкі, матываваная ацэнка практыкі, картка(і) інфарманта.

3.1. *Узор афармлення тытульнай старонкі дзённіка*:

ДЗЁННІК ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫКІ
студэнтаI курса спецыяльнасці «беларуская (руская) філалогія»
філалагічнага факультэта (*указаць вну*)
Прозвішча, імя, імя па бацьку

Месцы запісаў: (напрыклад, *г. Пінск;*
*в. Камень Пінскага раёна Брэсцкай вобласці;*
*в. Багданаўка Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці;*
Час: *з 17 ліпеня да 2 жніўня 2018 г.*)
Год

3.2. Змест дзённіка.

У левым куце наступнай пасля тытула старонкі ўказаць дзень і месяц. З наступнага радка – падрыхтоўчая работа: чаму фальклор збіраецца менавіта ў гэтых мясцінах, хто падказаў, хто дапамог, як шукалі інфармантаў, як яны сустракалі і г. д. Асаблівую каштоўнасць маюць творчыя партрэты выканаўцаў. Пасля па днях – інфармацыя па ўмовах запісу, інфармантах (з указаннем пашпартызацыі, як гэта разумеецца ў фалькларыстыцы), апісанні мясцовасці, праблемы ва ўсталяванні кантактаў з інфармантамі і інш.

*Пры афармленні дзённіка трэба ўказаць*:

– дакладную пашпартызацыю твора, каб было абсалютна зразумела, дзе, калі, ад кагоён запісаны: прозвішча, імя, імя па бацьку інфарманта, яго год нараджэння, нацыянальнасць, адукацыя, прафесія, адкуль родам, з якога часу пражывае ў гэтай мясцовасці, ад каго перайшла песня, казка (усё гэта складае ў фалькларыстыцы паняцце *пашпарту* фальклорнай адзінкі);

– характарыстыку абставін выканання: дзе, калі, хто прысутнічаў, рэагаванне, манера выканаўцы, рэплікі падчас выканання і г. д.

3.2. *Нумарацыя твораў* суцэльная на працягу ўсяго дзённіка. Нумарстаронкіставіццаў правым верхнім куце. На тытульным лісце нумар не пазначаецца. Побач з нумарам запісваецца назва твора. Калі яе не існуе, то назва даецца па першым радку. Ніжэй у дужках – азначэнне твора паводле слоў выканаўцы (напрыклад, «Як лён бяруць», «Як куста вадзілі» і г. д.).

*Узор:*

№1. Як куста вадзілі

Пытанне: Ці вадзіліў вашай вёсцы куста?
*Далей тэкст твора і неабходныя заўвагі. Гэта прыблізна выглядае так.*
Заўвагі: «вадзілі куста» – гэта пра абрад ваджэння куста» так гавораць.

3.3. Пасля апошняга дня назіранняў трэба абавязкова прадставіць сваю матываваную ацэнку практыкі: спадабалася ці не і чаму, а таксама парады і пажаданні (калі такія будуць).

3.4. У канцы дзённіка павінен быць *змест па жанрах з указаннем старонкі.*

*Узор:* ЗМЕСТ


К а з к а в а я  п р о з а
Пра жывёл:
«Ліса і воўк» Стар. 17–18
«Кот і певень» Стар. 33
Р э а л і с т ы ч н а я  п р о з а
Мемараты:
Пра Вялікую Айчынную вайну Стар. 9
Сямейныя гісторыі Стар. 51
і г. д.


3.5. *Картка(і) інфарманта.*
*Узор:*

<table>
<tr><td>Год</td><td>Картка інфарманта</td></tr>
<tr><td colspan="2">Прозвішча, імя, імя па бацьку.<br>Год нараджэння.<br>Пашпартызацыя:<br>а) месца запісу;<br>б) нацыянальнасць;<br>в) адукацыя;<br>г) мясцовы ці не (адкуль і калі прыехаў).<br>Колькі адзінак запісана (расшыфраваць па жанрах, напрыклад: агульная колькасць адзінак – 56, з іх:<br>а) легенд – 3:<br>– тапанімічных – 1;<br>– міфалагічных – 2;<br>б) успамінаў – 23:<br>– любоўныя гісторыі – 20;<br>– сямейныя выпадкі – 3.<br>Збіральнік Прозвішча, імя, імя па бацьку</td></tr>
</table>

4. ***Рэстравая ведамасць уліку запісаных матэрыялаў***.

*Узор*:

| № папкі (запаўняецца супрацоўнікамі архіва) | Год запісу | Месца запісу (вёска, горад, пасёлак, раён, вобласць) | Агульная колькасць адзінак, з іх па жанрах | Інфармант (указаць год нараджэння) | Збіральнік (указаць спецыяльнасць) |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2008 | в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці | 120 адзінак, з іх па жанрах: няказкавая проза: легендарная – 5; магічная проза: прыкметы – 18; сямейна-абрадавая проза: хрысцінная – 25; пазаабрадавая паэзія: прыпеўкі – 60. | І. П. Нікіфарэнка (1945) | Алена Анатольеўна Андрэева, руская філалогія |

**Увага!** *Пажадана размяркоўваць ведамасць на альбомнай старонцы (меню «Файл» / «Параметры старонкі»).*

5. ***Файл з базай дадзеных пэўнага населенага пункта***. Назва файла – па назве вёскі. Размяшчаць творы ў базе дадзеных пажадана ў адпаведнасці са зместам вучэбнага дапаможніка «Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік» (2009) – ад фальклорнай прозы да сучаснага гарадскога фальклору.

Калі інфармант адзін і той жа, указваць пашпартызацыю пасля кожнага твора не трэба, дастаткова толькі пасля апошняга з шэрагу запісаных ад аднаго чалавека твораў пазначыць: «Творы № 1–5 запісаў студэнт…» і далей па ўзоры.

6. ***Аўдыя- і відэазапісы*** таксама павінны мець поўную і дакладную пашпартызацыю. Напачатку выразна надыктоўваюцца звесткі пра збіральніка (імя, прозвішча, імя па бацьку, курс, аддзяленне, група), месца збору (вёска, пасёлак альбо горад, раён, вобласць) і інфарманта (імя, прозвішча, імя па бацьку, год нараджэння, нацыянальнасць, мясцовы ці не, адкуль прыехаў, калі немясцовы). Калі на гэта няма часу ў момант запісу, гэту інфармацыю неабходна ўказаць пасля фіксацыі твора (гл. раздзел «Метадычныя правілы запісу фальклорных твораў», с. 28 – 29 дадзенай праграмы).

Перад запісам кожнай асобнай фальклорнай адзінкі збіральнікам называецца яе жанр; калі ёсць заўвагі, трэба агучыць іх. Калі на гэта не хапае часу перад выкананнем інфармантамі твораў, агучваецца жанр пасля кожнага твора (гл. раздзел «Метадычныя правілы запісу фальклорных твораў», с. 28 – 29 дадзенай праграмы).

**Увага!** *Інфармацыя пра змест аўдыя- і відэазапісаў на дыску або флэшцы ўключае дакладны вопіс па назвах твораў (па першым радку, калі невядома назва) і іх парадкавы нумар. Па памеры яна павінна змясціцца ў слім ад дыска або ў канверт, у якім здаецца флэшка.* **Гэты спіс у электронным варыянце павінен змяшчацца і на дыску або флэш-накапляльніку разам з іншымі справаздачнымі матэрыяламі**.

*Узор афармлення вопісу да аўдыя- і відэазапісаў:*

| |
|---|
| ГОД ЗАПІСУ |
| Збіральнік: Свірко Вольга Эдуардаўна<br>Інфарманты: Міронччык Ірына Пятроўна (1936)<br>Міронччык Іван Сцяпанавіч (1926)<br>Аксак Тамара Рыгораўна (1932) |
| 1. Гульні на Каляды.<br>2. Размова пра калядную варажбу.<br>3. Размова пра сватанне.<br>і інш. |

### *Агульныя правілы афармлення інфармацыі на дысках і флэш-накапляльніках*

1. На электронным носьбіце (дыск, флэш-накапляльнік) размяшчаюцца тэкставыя файлы, аўдыя, відэа, фота, прыдатныя для прачытання на іншым камп'ютары. Гэта значыць, студэнт павінен у суправаджальным файле пазначыць, з дапамогай якіх праграм адкрываецца той ці іншы запісаны ім файл. Калі выкарыстоўваецца адмысловая кадзіроўка, змяшчаецца на дыску (флэшцы) праграма, з дапамогай якой файл можна адкрыць і прагледзець.

2. Кожны з файлаў (акрамя тэкставых) павінен мець каментарый: для фотаздымкаў пазначаецца, што ці хто зняты, па якой прычыне збіральнік уключыў гэтыя здымкі ў справаздачу па фальклорнай практыцы; афармленне аўдыяматэрыялаў на дыску гл. вышэй, у папярэднім падраздзеле; відэаматэрыялы таксама суправаджаюцца тэкставым файлам з каментарыем.

3. Справаздача на электронным носьбіце падаецца ў поўным аб'ёме: тытул, змест сабраных адзінак па жанрах (справаздачны мінімум – 50 адзінак фальклорнай прозы), дзённік з карткамі інфармантаў, рэестравая ведамасць, файл з базай дадзеных, аўдыя- і відэазапісы.

4. **Абавязкова робіцца вокладка з тытульнай старонкай да дыска або канверта, у якім змяшчаецца флэшка.**

*Узор афармлення тытульнай старонкі электроннага носьбіта*:

| |
|---|
| Матэрыялы фальклорнай практыкі<br><br>Прозвішча, імя, імя па бацьку<br><br>Склад дыска (флэшкі): дзённік, картка інфарманта, рэестравая ведамасць, фотаздымкі, 50 аўдыязапісаў, файл «База дадзеных пэўнага населенага пункта»<br><br>Кіраўнік<br><br>Год |

***Дадатковыя заўвагі.*** Лічбавыя носьбіты павінны быць у добрым стане (не паламаныя, не падрапаныя), дыскі – у слімах, флэшкі – у канвертах.

## 2. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ СПРАВАЗДАЧЫ СТУДЭНТА ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ

### Склад справаздачы

Па заканчэнні фальклорнай практыкі студэнт-першакурснік павінен прадставіць кіраўніку сабраныя і сістэматызаваныя фальклорныя матэрыялы, складзеныя **ў кардонную папку з завязкамі** (памер папкі – аркуш паперы фармату А4). У папцы павінны быць у наяўнасці:

– тытульны ліст на вокладцы папкі;

– змест па жанрах з указаннем колькасці адзінак кожнага жанру на адваротным баку вокладкі папкі;

– дзённік фальклорнай практыкі з назіраннямі па днях практыкі і тэкстамі твораў, у канцы якога змешчаны карткізбіральнікаў;

– рэестравая ведамасць уліку запісаных матэрыялаў;

– файл «База дадзеных пэўнага населенага пункта»;

– аўдыя- і відэазапісы з вопісам твораў, які ўкладваецца ў слім дыска або ў канверт з флэшкай;

– дыск або флэшка з афармленай на камп’ютары справаздачай.

### Крытэрыі выстаўлення адзнак

Сярэдняя адзнака – «6» балаў – выстаўляецца за выкананне справаздачнага мінімуму: запіс **50 адзінак фальклорнай прозы**, змешчаных у дзённіку, дзённікавыя назіранні, стварэнне картак інфармантаў, рэестравай ведамасці, базы дадзеных пэўнага населенага пункту, наяўнасць аўдыя- і відэазапісаў.

**Увага!** *Для студэнтаў завочнай формы навучання справаздачная колькасць зафіксаваных адзінак – 25-30; колькасць дзён праходжання практыкі – 7, аб’ём дзённіка – каля 15 старонак.*

Пры наяўнасці адзначанага мінімуму справаздача прымаецца да праверкі. У адваротным выпадку практыка лічыцца неадпрацаванай і адзнака не выстаўляецца.

Студэнт можа павысіць адзнаку пры ўмове:

« + 1» бал – зафіксаваць матэрыялы па адной з тэм праграмы-апытальніка;

« + 1» бал – прадэманстраваць высокую якасць запісаў, правільнае вызначэнне жанраў;

« + 1» бал – з густам аформіць справаздачу;

« + 1» бал – перавысіць мінімум запісаў на 30% і больш.

На паніжэнне адзнакі ўплываюць наступныя крытэрыі:

« – 1» бал – несвоечасовая здача матэрыялаў практыкі;

« – 1» бал – памылкі пры вызначэнні фальклорных відаў і жанраў;

« – 1» бал – нізкая якасць запісаў;

« – 1» бал – нізкая якасць афармлення справаздачы і картак.

Практыка не залічваецца, калі кіраўнік выявіць ХОЦЬ АДЗІН ФАКТ фальсіфікацыі матэрыялаў (перапісвання з анталогій і зборнікаў фальклорных матэрыялаў, перазапіс твораў з аўдыя сябра і г. д.).

# І Н Ф А Р М А Ц Ы Й Н А Я   Ч А С Т К А

Апытальнік для збору матэрыялаў па беларускім танцавальным фальклоры / распрацоўшчык М. А. Козенка. –Мінск, 1998.

Апытальнік для збору матэрыялаў па каляндарнай абраднасці беларусаў / распрацоўка В. І. Басько. –Мінск, 1998.

Апытальнік для збору матэрыялаў па сямейнай абраднасці беларусаў / распрацоўшчыкі Т. Б. Варфаламеева (Вяселле), Т. І. Кухаронак (Пахаванне), Т. П. Канстанцінава (Радзіны) / навук. рэд. Т. Б. Варфаламеева. –Мінск, 1998.

Баладныя песні (балады): метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальк. практыкі студэнтаў 1 курса філал. фак. / Р. М. Кавалёва,В. К. Каратай, Т. В. Лук'янава, Г. А. Жэгала; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск: БДУ, 2010.

*Балашов, Д. М.* Как собирать фольклор (руководство по сбору произведений устного народного творчества) / Д. М. Балашов. –М., 1971.

Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору БДУ: метад. рэкамендацыі па арганізацыі вучэбнай, навуковай і архіўнай работы. У 2 ч. Ч. 1 / Т. А. Марозава, Т. В. Лук'янава, В. К. Каратай, В. І. Палукошка, Ю. Ю. Атрошчанка, М. Ю. Латышкевіч; пад рэд. Т. А. Марозавай. – Мінск: БДУ, 2017.

Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору БДУ: метад. рэкамендацыі па арганізацыі вучэбнай, навуковай і архіўнай работы. У 2 ч. Ч. 2 / Т. А. Марозава, Т. В. Лук'янава, В. К. Каратай, В. І. Палукошка, Ю. Ю. Атрошчанка, М. Ю. Латышкевіч; пад рэд. Т. А. Марозавай. – Мінск: БДУ, 2017.

*Кабашнікаў, К. П.* Методыка збірання беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці / К. П. Кабашнікаў. – Мінск, 1978.

*Кавалёва, Р. М.* Беларускі фальклор: тыпавая вучэбная праграма для студ. філалаг. факультэтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» / Р. М. Кавалёва. – Мінск, БДУ, 2008.

*Кавалёва, Р. М.* Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік для студэнтаў І курса філал. фак. па спец. 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава. – Мінск, БДУ, 2008.

*Кавалёва, Р. М.* Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік для студэнтаў І курса філал. фак., якія навучаюцца па спец. 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «»Руская філалогія, 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: БДУ, 2009.

*Каладзінскі, В. В.* Метадычныя ўказанні па правядзенні фальклорнай практыкі студэнтаў першага курса філалагічнага факультэта / В. В. Каладзінскі. – Мінск, 1978.

Карагодныя песні (карагоды): метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальк. практыкі студэнтаў 1 курса філал. фак. / склад.: Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава; пад рэд. Р. М. Кавалёвай.–Мінск: БДУ, 2009.

*Криницкая, Н. А.* О методике собирания преданий / Н. А. Криницкая // Русский фольклор. –Л., 1985.

*Круглов, Ю. Г.* Фольклорная практика / Ю. Г. Круглов; 2-е изд. –М., 1986.

Масленічныя песні: метад. указанні і іл. матэрыял да праходжання фальк. практыкі студэнтаў 1-х курсаў філал. фак. / склад.: Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава, А. Ф. Літвіновіч; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск, БДУ, 2008.

Методичні рекомендації для збірання фольклорно-єтнографічного матеріалу про українські народні маски. – Київ, 1987.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта. Вып. 1. Каляндарная абраднасць Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці (серыя «Беларускі фальклор у запісах выкладчыкаў і студэнтаў»). – Мінск, 1997.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта. Вып. 2. Каляндарна-абрадавая паэзія (серыя «Беларускі фальклор у запісах выкладчыкаў і студэнтаў»). – Мінск, 1997.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта. Вып. 3. Беларуская вясельная абраднасць. – Мінск, 1998.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта. Вып. 4. Валачобныя песні (серыя «Беларускі фальклор у запісах выкладчыкаў і студэнтаў»). – Мінск, 1998.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта. Вып. 5. Купальская абраднасць. – Мінск, 1999.

*Морохин, В. Н.* Методика собирания фольклора: учебное пособие для вузов / В. Н. Морохин. – М., 1990.

Пазаабрадавыя песні: метад. указанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальк. практыкі студэнтаў I курса філал. фак. / склад.: Т. А. Марозава, В. К. Каратай, Т. В. Лук’янава [і інш.]; пад рэд. Т. А. Марозавай. – Мінск: БДУ, 2010.

*Селиванов, Ф. М.* Студенческая фольклорная практика: учебно-методическое пособие / Ф. М. Селиванов. –М., 1982.

Современный городской фольклор: метод. указания и ил. материал по проведению фольк. практики студентов 1 курса филол. фак. / О. В. Приемко, Т. А. Морозова, О. И. Полукошко; под ред. О. В. Приемко. – Минск, БДУ, 2014.

Фальклорыстыка: метад. дапам. для выкладчыкаў дысцыпліны «Фальклорыстыка» ў выш. навуч. установах па спецыяльнасцях: 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка. – Мінск: РІВШ, 2009.

Фальклорыстыка: тыпавая праграма для студэнтаў I курса філал. фак., якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05

02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / аўт.-склад.: І. В. Казакова, І. А. Швед; пад рэд. І. В. Казаковай. – Мінск, РІВШ, 2009.

Фальклорная няказкавая проза: метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальк. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава, В. С. Дзянісенка; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск: БДУ, 2012.

Фальклорная практыка: вучэб. праграма для студэнтаў І курса філал. фак., якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / аўт.-склад.: Р. М. Кавалёва, С. І. Крылова, Т. А. Марозава, В. В. Прыемка; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск, БДУ, 2009.

Фольклор славянских народов: учеб. программа для студентов І курса филол. фак. спец. 1-21 05 04 «Славянская филология», 1-21 05 02 «Русская филология» / авт.-сост. О. В. Приемко. – Минск: БГУ, 2008.

# ЗМЕСТ


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА .......... 3
ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ .......... 5
АРГАНІЗАЦЫЯ І КІРАЎНІЦТВА ПРАКТЫКАЙ .......... 5
ТЭХНІКА БЯСПЕКІ ПАДЧАС ПРАХОДЖАННЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫКІ .......... 6
1. АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ БЯСПЕКІ .......... 6
2. ПАТРАБАВАННІ БЯСПЕКІ ПАДЧАС ПРАЦЫ .......... 6
3. ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА ПРАЦОЎНАГА РАСПАРАДКУ .......... 7
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ .......... 7
І. ПАЛЯВАЯ ПРАКТЫКА .......... 7
Этапы правядзення палявой практыкі .......... 8
ТЭМАТЫКА ПАЛЯВОЙ ПРАКТЫКІ .......... 10
ІІ. ПРАКТЫКА Ў АРХІВЕ ПРЫ КАФЕДРЫ, ЯКАЯ АДКАЗВАЕ ЗА ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЮ (на прыкладзе Вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ) .......... 22
Этапы правядзення фальклорнай практыкі ў лабараторыі са студэнтамі стацыянара .......... 22
Этапы правядзення фальклорнай практыкі ў лабараторыі са студэнтамі завочнай формы навучання .......... 24
ІІІ. ПРАКТЫКА ПА ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ПРАГРАМЕ .......... 24
МЕТАДЫЧНЫЯ ПРАВІЛЫ ЗАПІСУ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ .......... 25
ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ПРАКТЫКІ .......... 27
1. ПРАВІЛЫ АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧЫ ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ .......... 27
ТЭХНІЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧЫ .......... 27
2. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ СПРАВАЗДАЧЫ СТУДЭНТА ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ .......... 33
ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА .......... 35

Вучэбнае выданне

# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА

Праграма для студэнтаў I курса
філалагічнага факультэта спецыяльнасцей
1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках),
1-21 05 02 «Руская філалогія» (па напрамках)

С к л а д а л ь н і к і :
**Прыемка** Вольга Віктараўна,
**Марозава** Таццяна Анатольеўна,
**Камлюк-Ярашэнка** Людміла Віктараўна

*У аўтарскай рэдакцыі*
Адказны за выпуск *Т. А. Марозава*
Камп’ютарная вёрстка *Н. Ю. Гусева*

Падпісана да друку 25.06.2018 Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,3. Ул.-выд. арк. 3,5. Тыраж 50 экз. Заказ 44.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/174 ад 12.02.2014.
Вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск.